УДК 811

# МОВА ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ З’ЯВА

*Д. А. Баркавец* (Магілёўскі інстытут МУС)
Навук. кір. *С. В. Венідзіктаў*,
канд. філал. навук, дацэнт

Сучасная навука, вызначаючы сутнасць мовы, разглядае яе як з’яву біялагічную, індывідуальную (псіхічную) і сацыяльную (грамадскую). Мова лічыцца сацыяльнай з’явай, бо яна не перадаецца генетычна; дзіця авалодвае мовай калектыва (соцыуму), у якім выхоўваецца. Паралельна ідзе працэс засваення культурных норм і мадэлей, якія перадаюцца праз моўную сістэму. Мова індывіда развіваецца толькі ў грамадстве, пад уплывам калектыва (культурнага асяроддзя). Такім чынам, мова – з’ява сацыякультурная, а не выключна біялагічная, індывідуальная.

Камунікацыя ў шырокім сэнсе існуе не толькі ў чалавечым грамадстве, але і ў біялагічных сістэмах; мы таксама павінны ўлічваць зносіны чалавека з электроннымі прыладамі (новы тым камунікацыйнай актыўнасці, што знаходзіцца на памежжы моўнага і праграмнага абмену інфармацыяй). Ва ўсіх выпадках адбываецца перадача інфармацыі, спецыяльна або адвольна пасланай адпраўшчыкам і атрыманай адрасатам.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пры аналізе фактаў або працэсаў зносін неабходна адрозніваць два планы: спосаб або форму выяўлення (напрыклад, літара для абазначэння гуку) і змест перадаваемай інфармацыі. Зносіны людзей ажыццяўляюцца ў асноўным з дапамогай гукавой гаворкі. У той жа час невярбальныя формы адыгрываюць значную ролю ў моўных зносінах паміж людзьмі. Маўленчая камунікацыя ўяўляе сабой другую сігнальную сістэму рэчаіснасці, якая будуецца на аснове першай, агульнай для чалавека і жывёл [1].

Моўныя зносіны заўсёды засноўваюцца на аваладанні (стыхійным або свядомым) дадзенай мовай удзельнікамі зносін, набытых ведах. Моўная камунікацыя – гэта не проста паведамленне якіх-небудзь фактаў або перадача звязаных з імі эмоцый, але і мэтанакіраваны абмен думкамі аб гэтых фактах і з'явах.

Такім чынам, як узорны варыянт агульнаўжывальнай мовы (літаратурная мова), так і дыялекты, сацыяльныя адгалінаванні (прафесіяналізмы, арго, слэнг і інш.) з'яўляюцца праявамі таго ці іншага сацыякультурнага асяроддзя, што дазваляе вызначаць мову як з'яву сацыякультурную.

### Літаратура

1. **Венидиктов, С. В.** Риторика : учебник для курсантов и студентов учреждений высшего образования по юридическим специальностям / С. В. Венидиктов, С. И. Даниленко. – Минск : РИВШ, 2017. – 236 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова